# ШКЛЯНОЕ РАМЯСТВО...



Фота Надзеі БУЖАН

Шкляная палачка разаграваецца на гарэлцы і «намотваецца» на металічны інструмент. Так атрымліваюцца пацеркі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Аляксандр тым часам працаваў на заводзе інжынерам. І дапамагаў жонцы раскручваць справу: фатаграфаваў упрыгажэнні, ездзіў з ёй на выстаўкі. А потым і сам захапіўся, звольніўся з завода і падаўся ў рамеснікі. Лідзія такому творчаму саюзу рада: Аляксандр як інжынер падказвае, як можна тэхнічна ўдасканаліць вырабы.

Пара працуе ў дзвюх тэхніках. Лэмпворк — работа са шклом на газавай гарэлцы, і ф'юзінг — плаўленне шкла ў печы. З нядаўняга часу ўзяліся і за фурнітуру, бо якаснай і таннай у Беларусі мала, а калі купляеш дарагую — павышаеш канчатковую цану ўпрыгажэнняў. Тут якраз і спатрэбіліся Сашавы веды па апрацоўцы металу. Цяпер ён вырабляе ланцужкі і пярсцёнкі з мельхіёру, медзі, тытану. Апошні рамеснікам асабліва падабаецца: пры абпале ён набывае прыгожыя адценні — фіялетавае, жоўтае, блакітнае.

Пры нас Ліда вырабляе пацеркі. Над полымем гарэлкі ў адной руцэ трымае шкляную палачку, у іншай — тонкі металічны стрыжань, на які «намотвае» расплаўленае шкло. Каб абараніць вочы, дзяўчына надзявае спецыяльныя акуляры. Гатовыя пацеркі яна кладзе на вогнетрывалы матэрыял, каб астылі.

Лэмпворк — дарагое хобі. Гарэлка каштуе ад 400 рублёў, печ (абпальваць пацеркі, каб яны былі не такімі крохкімі) — дзве тысячы. Плюс прамысловая выцяжка і самі матэрыялы. Лідзія прызнаецца: у яе, на той момант студэнткі, такіх грошай не было, адкрыць справу дапамаглі бацькі.

**Шкляныя вырабы сям'і прыйшліся даспадобы не толькі беларусам. Ёсць пакупнікі з Італіі, Ізраіля, Германіі, ЗША, Турцыі.**

Для вырабаў выкарыстоўваецца італьянскае і амерыканскае шкло. Звычайнае аконнае не падыходзіць. Аляксандр тлумачыць: «У кожнага шкла ёсць каэфіцыент цеплавога расшырэння. У кавалачкаў, якія адзін да аднаго прыплаўляюцца, каэфіцыенты павінны супадаць. Тады выраб будзе трывалым. Вытворцы мастацкага шкла сочаць, каб гэты паказчык заставаўся аднолькавым ва ўсіх партыях. А для вытворцаў вокнаў ён не такі важны, бо ў іх іншыя задачы — напрыклад, каб пузыркоў не было. Таму, калі вы сплавіце асколкі з розных вокнаў, яны будуць адвальвацца».

Цікавімся, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца рамеснік, калі адкрывае сваю справу?

— Складана пакінуць работу па найме, бо, калі працуеш на сябе, ніхто не абяцае пастаяннага заробку і сацыяльны пакет, — адказвае Лідзія. — Ты едзеш на кірмаш на свой страх і рызыку. Нават цяпер я кожны раз хвалююся, не ведаю, ці прыйдуць да мяне пакупнікі.

— У нас школьная і ўніверсітэцкая сістэма рыхтуе наёмных работнікаў, — лічыць Аляксандр. — Таму я рэкамендаваў бы ўдзяліць увагу бізнес-літаратуры, паглядзець ролікі ментараў, каб ведаць, як канкурыраваць і куды рухацца. Людзі часта думаюць, што калі яны выпусцяць прыгожыя рэчы, то ўвесь свет будзе каля іх ног. А зрабіць прыгожа — гэта наўрад ці нават палова поспеху.

— У мяне ёсць думка, што лепш сваю справу пачынаць у крызіс, — дзеліцца Лідзія. — Я сама пачынала ў 2011 годзе. Долар вырас, людзям увогуле не да ўпрыгажэнняў было... Затое калі ўсё атрымалася ў крызіс, ты будзеш малайцом і ў звычайны час.

Работа работай, але мастацтва немагчыма без натхнення. Якую тэму задаць калекцыі, Лідзе падказвае настрой. Вясной, напрыклад, калі душа патрабуе яркіх фарбаў, дзяўчына выпусціла серыю завушніц і пярсцёнкаў з кветкавымі матывамі. Сашу натхняюць прагулкі, асабліва па закінутых ландшафтах.

Аўтарскія талеркі каштуюць дорага: па сто, дзвесце рублёў. Рамеснікі тлумачаць, што гэтая цана апраўданая. Шмат матэрыялу патрэбна, працы. Талеркі робяцца доўга — з пачатку года толькі дзесяць штук выпусцілі. Бугаевы адносяць іх да прадметаў мастацтва. Суп з такой не паясі, жартуюць.

За творчасцю іншых рамеснікаў Лідзія і Аляксандр таксама сочаць. Купляюць карціны, інтэр'ерныя лялькі. А вось упрыгажэнні дзяўчына носіць толькі свае.

Ці проста мужу і жонцы весці бізнес разам?

— Гэта вельмі дапамагае на першым этапе, бо ў цябе ёсць падтрымка. Але потым разумееш, што трэба раздзяляць дзелавыя і асабістыя адносіны, — заўважае Аляксандр.

— Спрэчкі ва ўсіх ёсць, — кажа Лідзія. — Але нам трэба дамаўляцца, калі едзем на выстаўку. Нельга проста бразнуць дзвярыма. Таму мы вырашаем: сварыцца будзем пасля, а цяпер проста робім агульную справу. Гэта дысцыпліне. Мы раздзялілі сферы і не ўмешваемся ў творчасць адно аднаго.

Шкляныя вырабы сям'і прыйшліся даспадобы не толькі беларусам. Ёсць пакупнікі з Італіі, Ізраіля, Германіі, ЗША, Турцыі. Так, рамеснікаў цяпер шмат, трэба старацца, каб прасунуць сябе. Але Бугаевы ўпэўнены: заўсёды ёсць шанц на поспех, калі чалавек любіць справу, якой займаецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



Аляксандр, акрамя талерак, вырабляе фурнітуру для ўпрыгажэнняў.

*Мары — збываюцца!*

# «Трэнерам хацела быць з дзяцінства»



**Прайшло ўжо амаль пяць гадоў, як цяперашні майстар спорту Таццяна Мілюша скончыла факультэт масавых відаў спорту ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры. Па размеркаванні трапіла ў сваё родныя Баранавічы і з таго часу працуе трэнерам-выкладчыкам па спартыўнай гімнастыцы ў спартыўнай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву. Тут у яе свая група, якая ўжо дасягнула добрых вынікаў.**

Тані было пяць гадоў, калі ў дзіцячым садзе раздавалі запрашэнні на заняткі ў секцыю па спартыўнай гімнастыцы. Адно з іх трапіла ў рукі бацькоў, і з яго пачаўся шлях маленькай дзяўчынкі ў вялікі спорт. Як часта бывае, штосьці спачатку не атрымлівалася, ахоплівала роспач, і хацелася ўсё кінуць. Але трэнер верыла ў выхаванку і падтрымлівала яе. Таня брала сябе ў рукі і зноў актыўна займалася трэніроўкамі, якія з часам станавілася ўсё больш, пакуль яны не сталі штодзённымі. Пры гэтым і вучыцца добра паспявала.

— Перад трэніроўкамі страху не было. Мне падабалася займацца гімнастыкай, выступаць на спаборніцтвах у розных гарадах, заводзіць новыя знаёмствы. І я заўсёды ведала, што стану трэнерам. Канешне, часам ленавалася, за што «атрымлівала». Былі і кепскія выступленні. Але гэта нармальна... Заўсёды быць пераможцам немагчыма, — кажа Таццяна.

На спаборніцтвах дзяўчына хвалявалася за выкананне практыкаванняў на ўсіх снарадах, але найбольш — на бервяне. Ён адзін з самых складаных у гімнастыцы. Нягледзячы на гэта, снарад для дзяўчыны і дагэтуль самы любімы.

Канешне, у гімнастцы ёсць і асабістыя дасягненні. На апошніх рэспубліканскіх спаборніцтвах, якія праходзілі ў 2015 годзе ў Мінску, Таццяна ў мнагаборстве заняла другое месца. У фіналах у асобных відах былі першыя месцы на бервяне і ў вольных практыкаваннях, а ў апорным скачку — другое месца. Акрамя гэтага, раней былі этапы Кубка свету (Германія, Чэхія). Дзякуючы дэманстрацыі добрых вынікаў дзяўчына трапіла ў зборную Беларусі.

На пытанне, ці быў час займацца чымсьці, акрамя спорту, Таццяна адказвае адмоўна. Зрэшты... Неяк двойчы, нягледзячы на строгі рэжым, уцякалі з дзяўчатамі на дыскатэку, хоць і ведалі, што потым на трэніроўцы будзе цяжка.

Таццяна расказала і пра тое, як праходзіць набор дзяцей сёння:

— Спачатку дзеткі з бацькамі прыходзяць на прагляд. Пачынаць займацца можна ўжо з пяці гадоў. Канешне, цяжка адразу сказаць, ці атрымаецца з дзіцяці гімнаст, бо ў некаторых расцяжка выдатная, а сілы ў руках не хапае. Ужо ў канцы першага года трэніровак праходзяць спаборніцтвы. Старэйшыя дзеткі займаюцца па тры гадзіны ў дзень. У дзяўчынак гэта апорны скачок бервяно, вольныя практыкаванні і брусы.

На спартыўную гімнастыку ходзяць і хлопчыкі, але ў суразмоўніцы займаюцца шэсць дзяўчынак ад 8 да 9 гадоў. Хтосьці нават ужо паспеў выступіць як у нашай краіне, так і за мяжой, і заняць прызавыя месцы. Нягледзячы на водпуск па доглядзе за дзіцяці, Таццяна праводзіць трэніроўкі тры разы на тыдзень: дзяўчынкі рыхтуюцца да наступных спаборніцтваў.

Пра стаўленне да заняткаў дзяцей гімнастыкай Таццяна гаворыць так:

— Сёння, на жаль, сярод іх шмат хворых, таму для агульнага развіцця яна лішняй не будзе. Першыя два гады заняткаў дакладна ніяк не пашкодзяць. Калі я бачу, што ў некаторых маіх вучняў дрэнна атрымліваецца, раю бацькам паспрабаваць іншыя віды спорту.

Якімі якасцямі павінен валодаць дзіцячы трэнер?

— Па-першае, гэта камунікабельнасць. Першыя два гады неабходна кантактаваць не толькі з дзецьмі, але і з бацькамі, бо самі маленькія выхаванцы вельмі часта сароміюцца штосьці сказаць, — адказвае суразмоўніца. — Па-другое, да кожнага павінен быць свой падыход: камусьці заняткі даюцца лягчэй, некаму — цяжэй. З дзеткамі неабходна наладжваць кантакт, але і песціць іх нельга, бо добрых вынікаў не будзе.

Таццяна ўжо чатыры гады замужам. Яе муж Дзмітрый таксама спартсмен, чэмпіён Беларусі па боксе. Ён увайшоў у дзясятку лепшых баранавіцкіх спартсменаў па выніках 2016 года. Працуе трэнерам па боксе ў той жа школе, што і жонка. Разам яны выхоўваюць сына Яраслава, хлопчыку хутка два гады. З часам бацькі без сумневу аддадуць яго ў гімнастыку.

**Таццяна ЛАЎШ.**

*Працоўнае лета*

## ЯНЫ ПАЧЫНАЮЦЬ НА БЕЛАЭС

**11 ліпеня Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў ГА «БРСМ» плануе правесці ўрачыстае адкрыццё трэцяга працоўнага семестра — 2017 на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі — пляцоўцы будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Астраўцы.**

У ім возьмуць удзел байцы зводнага беларуска-расійскага студэнцкага будаўнічага атрада імя двойчы Героя Савецкага Саюза маршала Мікалая Іванавіча Крылова, а таксама ганаровыя госці мерапрыемства.

Праграма дня насычана мерапрыемствамі і ўключае ў сябе ўрачыстую цырымонію адкрыцця працоўнага семестра з уручэннем сімвалічных працоўных пуцёвак, «Адкрыты дыялог» на тэму «Моладзь будуе Саюз», майстар-клас «Праца — гэта крута» ад удзельнікаў студэнцкага атрада (наведванне аб'ектаў работы студатрадаўцаў).

Работу зводнага студэнцкага будаўнічага атрада Саюзнай дзяржавы на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі «БелАЭС 2017» у складзе 300 байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў плануецца арганізаваць з 4 ліпеня па 26 жніўня.

У склад атрада ўваходзяць 16 лінейных будаўнічых атрадаў з Беларусі і 3 лінейныя будаўнічыя атрады з Расійскай Федэрацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*